Схільнасць да стварэння ўласных міфалагем на славянскім падмурку ўласціва і А. Мінкіну. Парадаксальна, але ў вобразе яго “закаханага ў зоркі” [7, с. 47] чалавекаптаха (“Балада пра чалавекаптаха”), створанага, відавочна, пад уплывам розных культурных традыцый, таксама больш выразна пазнаецца сімволіка беларускага ваўкалака, чым антычнага Ікара ці хрысціянскага анёла. Гэта маргінальная істота, не прынятая і не зразуметая насельнікамі акаляючага свету, асуджаная на адзіноту, нягледзячы на яе высакародныя памкненні:

Нехта ўсімі забыты
цягнуў па бруку крылаў ашмоцце
і праклінаў жалезабетонныя пліты
і задыхаўся ў бензінавым смуродзе.

А мерцвякі закутыя ў бляшанкі
як жамяра ў бурштын
праносіліся ля яго маланкай
слухаючы сімфонію шын [7, с. 47].

Такім чынам, зварот А. Сыса і А. Мінкіна да славянскай міфалогіі дэтэрмінаваны пошукам асноў беларускай духоўнасці, імкненнем да спасціжэння сутнасных асноў быцця і шляхоў да адраджэння-выратавання нацыі. Асаблівасцю лірыкі абодвух аўтараў з’яўляецца і спалучэнне элементаў язычніцкай і хрысціянскай веры ў прасторавым полі аднаго верша, схільнасць да стварэння ўласных міфалагем на славянскім падмурку і неарамантычнае светаадчуванне. Катэгарычныя адрозненні ў мастацкім выкарыстанні міфалагем абумоўлены мастацка-эстэтычнымі арыентацыямі: на Я. Купалу ў А. Сыса і на М. Багдановіча – у А. Мінкіна.

**Спіс літаратуры**

1 Конан, У. У пошуку страчанага раю (Міфалагічныя і біблейскія матывы ў літаратуры XX стагоддзя) / У. Конан // Полымя. – 2004. – № 4. – С. 190–206.
2 Мінкін, А. Пенаты : паэзія / А. Мінкін. – Мінск : І. П. Логвінаў, 2007. – 146 с.
3 Шынкарэнка, В. З верай у чалавечнасць: адметнасці вобразна-паэтычнай сістэмы сучаснай беларускай літаратуры / В. Шынкарэнка. – Гомель : РНПУП “РАТОН”, 2001. – 200 с.
4 Сыс, А. Лён : выбраныя творы / А. Сыс. – Мінск : Кнігазбор, 2006. – 436 с.
5 Штэйнер, І. Дняпроўскія матывы / І. Штэйнер. – Гомель : Сож, 2009. – 368 с.
6 Сыс, А. Сы с: вершы / А. Сыс. – Мінск : Маст. літ., 2002. – 159 с.
7 Мінкін, А. Расколіна : вершы і паэма / А. Мінкін. – Мінск : Маст. літ., 1991. – 77 с.

УДК 821.161.3-31*В.Бечык

А. Ф. БЯРОЗКА
(г. Гомель, ГДУ імя Ф. Скарыны)

## ДЗЁННІК ВАРЛЕНА БЕЧЫКА: АСАБЛІВАСЦІ ПАЭТЫКІ

*На матэрыяле дзённіка В. Бечыка ў артыкуле разглядаецца жыццёвы і творчы шлях крытыка. Асаблівая ўвага надаецца разгляду сістэмы светапогляду аўтара, якая сфармавалася ў яго ў прадчуванні блізкасці ўласнай смерці.*

Дзённік В. Бечык пачынае весці з 1959 года. У гэты час дваццацігадовы малады чалавек толькі скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт і пачаў працу выкладчыкам



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

беларускай і рускай мовы і літаратуры ў Плiскай сярэдняй школе Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці. На працягу трох гадоў дзённік для яго – гэта запісы настаўніка, дзе ён спрабуе прааналізаваць сваю педагагічную дзейнасць, разабрацца ва ўзроставай псіхалогіі навучэнцаў, зразумець, як больш якасна выконваць асноўныя задачы класнага кіраўніка. Іншых тэм для аўтара не існуе. В. Бечык нібыта стварае метадычны дапаможнік для наступных пакаленняў педагогаў. У запісах выразна выяўляецца арыентацыя на магчымага чытача, узровень інтымнасці, спавядальнасці зведзены да мінімуму: "Перада мной звычайны клас і звычайныя дзеці. Але для мяне яны незвычайныя. <…> Бывайце, сябры! Шчаслівых дарог вам у самастойным жыцці!" [1, с. 38]. Таму няма нічога дзіўнага, што гэтая частка дзённіка В. Бечыка была апублікаваная яшчэ ў 1964 годзе ў часопісе "Маладосць" пад назвай "Клас восьмы, клас дзевяты...".

У 1962 годзе В. Бечык паступае ў аспірантуру пры кафедры беларускай літаратуры БДУ. Пачынаецца новы этап яго жыццёвага шляху і, як вынік, змяняецца тэматыка дзённікавых запісаў: "У тую восень, калі мае вучні сталі дзесяцікласнікамі, я паступіў у аспірантуру" [1, с. 38]. Градус спавядальнасці прыкметна павышаецца, бо гэта ўжо запісы для асабістага карыстання, якія не разлічаны для староннягa чытання. З 1966 года дзённік В. Бечыка паступова пачынае набываць тыя абрысы, якія ўзвядуць яго ў статус аднаго з унікальных асабістых дакументаў беларускай літаратуры 20 стагоддзя. Прыкметна змяняецца і само стаўленне крытыка да спавядальна-дзённікавай прозы. З кожным годам ён будзе ўсё больш ўсведамляць патэнцыял гэтай жанравай формы: "Аказваецца, можна прывыкнуць да запісаў. Без іх нечага не хапае" (1967) [1, с. 64]; "Запіс, пісьмо, нататка – усё патрабуе падрыхтоўкі і засяроджанасці" (1967) [1, с. 75]; "Мы не занатоўваем і забываем многія і нечаканыя хады свайго мыслення, мала сумуем вопыт, не ўмеем адысці ад сябе. Беднім уласную духоўнасць сурагатнай, пераважанай малаадукаванымі тлумачэннямі культурай" (1970) [1, с. 110]; "Без запісной проста не жылося – незваротна сплывалі дні, вятры, галоўнае ж – сонечныя ўзлёты душы" (1978) [1, с. 173] і г. д. У жыцці В. Бечыка надыходзіць перыяд бурных жарсцей і любоўных захапленняў. Таму на старонках дзённіка ў гэты час пастаянна мільгаюць ініцыялы каханых крытыка, які спрабуе вызначыць сваё стаўленне да іх, зразумець, хто з іх тая адзіная, што стане яго жонкай. Аўтар з гэтага часу пачынае фіксаваць на паперы свае самыя патаемныя думкі і жаданні. Толькі тут ён можа памарыць аб літаратурнай славе, толькі тут ён можа запісаць свае першыя паэтычныя вопыты: "Вершы сняцца ўжо другую ноч. Першы раз снілася: мае ўдалыя вершы набраны, але ў гранках начыста перароблены" [1, с. 40]; "Сёння ўпершыню ўдалося падчапіць пяром пару радкоў, мо таму, што я ў Маскве, на рускай мове. Не дужа змястоўныя, але няхай будуць. Мне ни к чему поспешная работа / И суета корыстного расчета, / Но, кажется, и я от них устал" [1, с. 43].

На старонках дзённіка В. Бечыка пачынае прысутнічаць пастаянны маўклівы суразмоўца, да якога аўтар нястомна звяртаецца ў хвіліны адзіноты і тугі. Гэтым суразмоўцам з'яўляецца яго аднадумец і бліжэйшы сябар –таленавіты пісьменнік Ігар Хадановіч, які быў забіты ў выпадковай вулічнай бойцы. Чалавек рэдка бывае гатовы да смерці блізкіх яму людзей. Ён заўсёды цешыць сябе надзеямі, што падобная трагедыя здарыцца яшчэ няхутка. Таму многае з таго, аб чым ён думае, што адчувае, так і застаецца нявыказаным, прыносячы яму ў далейшым нястомныя душэўныя пакуты. Страчаныя і ўжо незваротныя імгненні жыцця В. Бечык спрабуе кампенсаваць з дапамогай дзённікавых запісаў, у якіх фіксуе ўсё тое, пра што не паспеў сказаць І. Хадановічу асабіста: "Дарагой Ігарок! Ты з намі, мы з Табою" [1, с. 208]; "Кніжка мілага Ігара, табой пачну гэту запісную. Зноў са мною Ігар – як у рэальным, не прывідным сне. Сне – бо ведаю, што І. – толькі ў кніжцы. Тут, у кніжцы, – частка маёй душы, майго сумлення. <…> Чалавек трапяткога сэрца, пастаяннай узрушанасці і натхнення, ён такім існуе ў гэтай кніжцы. <…> Сапраўды, гэта быў незвычайны талент – талент, арганічна звязаны з яго асобай, з яго маральна-духоўнай сутнасцю, з яго перакананнем, што жыць трэба лепш, што «ў чалавеку ўсё павінна быць прыгожым»" [1, с. 50]. Калі чытач не пазнаёміцца з дзённікам В. Бечыка ў поўным



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

аб’ёме, а прачытае толькі яго асобныя вытрымкі, то ў яго можа ўзнікнуць ілжывае адчуванне таго, што аўтар узвёў І. Хадановіча ў ранг куміра: “«Хворы на душэўную чэснасць». Гэта наш ідэал. Усім нам хочацца і патрэбна прычасціцца ў яго чысціні” [1, с. 50]. Аднак сам В. Бечык, які пастаянна падкрэслівае маральную і творчую веліч аднагодка, на наш погляд, робіць акцэнт на вострым пачуцці віны перад заўчасна памерлым таленце беларускай літаратуры: “Мне здаецца, я жыву на працэнты добрай памяці Ігара – на мяне пераносяць частку яго абаяльнасці” [1, с. 40]; “…Па ўсіх, хто рана адышоў, – усё больш самотна. І Лена Грыневіч, і Ігар Хадановіч, і Іван Сяргееў, і Алесь Міклуш, і Сымон Блатун, і Сербантовіч, Нядзведскі, Кажушкоў, Адам Кляніцкі, Самусевіч… Яшчэ, яшчэ – трывожаць адтуль, з незваротнасці” [1, с. 175].

Смерць І. Хадановіча становіцца прычынай глыбокага душэўнага крызісу двадцацісемігадовага крытыка: “У жыцці чалавека бывае раптоўны момант вострай пераацэнкі сябе і ўсіх каштоўнасцей (напрыклад, хвароба)” [1, с. 188]. З гэтага часу ў дзённіку аўтара пераважаюць запісы, якія дэманструюць яго песімістычны погляд на свет. Стваральнік такіх кніг як “Свет жывы і блізкі” (1974), “Шлях да акіяна: кніга пра паэзію А. Куляшова” (1981), “Прад высокаю красою: літаратурна-крытычныя артыкулы” (1984), якія па ўсеагульным прызнанні складаюць залаты фонд беларускага літаратуразнаўства, падвяргае сябе ўстойліваму неміласэрнаму самабічаванню: “…Я не паэт, не празаік, не крытык і як чалавек – мнагазначны мінус…” [1, с. 48]; “Па-сутнасці, маё жыццё бязмэтнае, бо жыць сумленна, шчыра (я далёкі нат ад гэтага) можна яшчэ і філісцёру” [1, с. 98] і інш.

Дэпрэсіўны стан, які вызначае характар запісаў В. Бечыка, яшчэ больш пагаршаецца ад нястомных хвароб, якія пачынаюць адольваць яго яшчэ ў маладыя гады: “Быў на прыёме ў неўрапатолага… Колькі можна!” [1, с. 46]; “Няўжо ўсё жыццё пройдзе з надламанай памяццю і бясконца будзе мучыцца болеем, бяссонніцамі і туманам стомленая галава?! А жылося…” [1, с. 57] і інш. Нават уласныя хваробы В. Бечык разглядае як сведчанне яго містычнай сувязі з І. Хадановічам і як своеасаблівае пакаранне за яго гібель: “Такім чынам і ў маім нездароўі вызначаецца нейкая пераклічка з няшчасцем Ігарка…” [1, с. 40] Ад сумных роздумаў не ратуе і праца літаратурным супрацоўнікам рэдакцый газеты “Літаратура і мастацтва” і часопіса “Нёман”, а потым і навуковым супрацоўнікам Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук БССР: “Хачу жыцця поўнага, чыстага, святога, а сяджу ў драбязе, лухце, мітусні” [1, с. 60]; “Цяжкая каўзаніна па чужых рэцэнзіях – колькі ўжо наварочана за гэтыя тры гады…” [1, с. 105] і інш. Уласная літаратурна-крытычная дзейнасць, якая мела нязменны поспех і выклікала незвычайную цікавасць як у калег-даследчыкаў, так і саміх паэтаў, ацэньваецца В. Бечыкам вельмі крытычна і скептычна: “Пісьменнікі шчаслівейшыя – яны пішуць творы, дзе гавораць з сабою і другімі, пра сябе і пра другіх. А тут душэўнае жыццё астаецца па-за рэцэнзентскай шумяццю” [1, с. 60]; “Яшчэ недарэчнасць: у мяне жыццё – ланцуг рэцэнзій, скляпаных высільваннем” [1, с. 84]; “Усе мае артыкулы, рэцэнзіі – голас адзіноты, якая горнецца да розуму, дабра і чалавечнасці” [1, с. 110]. Нават на старонках дзённіка крытык пастаянна незадаволены сабой, ні разу не выказаўшы пачуццё задавальнення і радасці не ад створанага ім, не ад сваіх чалавечых якасцяў: “А я прыпорціў сябе эгаізмам, аслабіў спасылкаю на нястачу сіл і аддаліўся ад многіх, хто мяне цэніць” [1, с. 102]. Як правіла, кожны такі запіс, што ўяўляе сабой свайго роду бязлітасны маральны самасуд, заканчваецца вызначэннем для сябе тых правілаў, якія, на думку аўтара, павінны палепшыць яго чалавечую прыроду: “Напісаць апавяданне…” [1, с. 60]; “Сёння жыць, ісці ўперад – пісаць пра Пысіна” [1, с. 82]; “Трэба зноў пачаць жыць па-новаму” [1, с. 112]; “Не чытаць па-чэшску, славацку – абраза ўласнай годнасці” [1, с. 262] і інш. Паказальна, што пры гэтым В. Бечык ніколі не скардзіцца на свой лёс. Адзін з нешматлікіх запісаў такога роду датуецца 13 студзеня 1971 года: “Мне кепска, патрэбна новая галава, новы рэжым, новыя веды, думкі і кнігі. <…> Ніколі не было ў мяне акрыленай любові, што давала радасць, пяшчоту і гармонію. Заўсёды была цяга, якой пярэчыў розум. І нічога не абяцалася добрага, а толькі благое” [1, с. 114].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Адметнай асаблівасцю творчай манеры В. Бечыка, якая ярка выявіла сябе на старонках дзённіка, з'яўляецца не толькі яго імкненне да максімальна шчырага запісу ўласных патаемных думак, але і жаданне іх прааналізаваць. Прачытанне ўласных запісаў дапамагае аўтару ўсвядоміць усю супярэчлівасць свайго жыцця, а ўслед за гэтым падштурхоўвае да адшукання тых прычын, што прывялі яго да такога бязрадаснага існавання: "Што мне так хочацца сабраць у сабе ўсю чалавечую тугу і пакуту? Чаму так верадліва, чаму душа цягнецца да ўсяго балючага, што ёсць у кнігах? Быццам хоча яшчэ большага аб'ёму і большай варыянтнасці. І думкі аб недарэчнасці пакут. І прыгаворванні: «Но надо жить»" [1, с. 114–115]. Страціўшы надзею самастойна адшукаць адказы на тыя пытанні, ад якіх ён пакутуе, В. Бечык шукае дапамогі ва ўсіх знаёмых людзей: "Я ўсе гэтыя дні, многія дні – ад 14 студзеня – пытаўся ва ўсіх, у чым сэнс жыцця, хоць ніхто і не мог даць адказу" [1, с. 115]. Безвыніковыя разважанні аб сутнасці быцця толькі ўзмацняюць душэўны крызіс В. Бечыка, які дасягае свайго апагею напярэдадні яго саракагоддзя. Гэта ўжо прызнанне чалавека ў роспачы, які страціў веру ў магчымасць што-небудзь змяніць у сваім жыцці да лепшага: "Перад сарака гадамі ўжо вычырпаны ўсе авансы, цяпер – будзень жыцця без маладосці, дужасці, перспектывы. <…> Чаго хочаш? Да чаго імкнешся? Чым жывеш? Галоўны дакор і страх – велічыня страчанага. Колькі людзей прамінуў, як недарэчна драбніўся, як многа мітусіўся, прытвараўся, сябе і іншых падманваў… Не мець дзяцей. Цяпер ужо добра адчуваеш, якая гэта страта" [1, с. 186]. У хвіліны такога абсалютнага адчаю многія людзі шукаюць выратавання ў рэлігійнай веры. Аднак В. Бечык беспаспяхова спрабаваў зрабіць гэта яшчэ дзевяць гадоў таму: "Не прашу я ў Бога нічога, а толькі цяжкой і строгай дарогі, але з імгненнямі шчасця, што дагэтуль усё яшчэ ў недасяжнасці…" [1, с. 104]. Цяпер жа крытык, які расчараваўся ў жыцці, усё часцей пачынае задумвацца аб смерці: "Мы зусім мала думаем аб смерці, адсоўваем яе – яна для нас заўсёды застаецца нерэальнасцю, фікцыяй, як у самым няспелым дзяцінстве. А між тым адусюль вее яе суровый холад, яе нефальшывая і неабвержаная праўда" [1, с. 143]. Пра гэтую тэндэнцыю, якая ўсё набірала моц у светапоглядзе В. Бечыка, сведчаць і наступныя запісы ў дзённіку: "Схадзіў яшчэ раз на могілкі да Ігара і Сербантовіча. Цудоўны партрэт Сербантовіча і надпіс: Тых, з кім дзеліцца неба сакрэтам, / Маладым забірае зямля" [1, с. 121]; "Быў на могілках. Схадзіў да ўсіх «сваіх»" [1, с. 121] і інш. Феномен і загадка смерці становіцца пастаяннай крыніцай разважанняў аўтара: "Не разважаннямі аб смерці, вядома, канчаць трэба гэту запісную. Але вось патрапіла меркаванне: мы развітваемся не з жыццём, не з людзьмі – бо яны застаюцца. Мы развітваемся з сабой, са сваім целам, са сваім імем, і гэта прыводзіць у недаўменне" [1, с. 143]. В. Бечык ужо нібы прадчувае трагічную развязку свайго жыцця і рыхтуецца да смерці: "Перад смерцю Платон памыў сам сябе, каб другім не давялося. Трэба абмываць сябе кожны дзень. Мне здаецца, што я не вытрымаю новай восені – пустаты і сцюдзёнкі, а між тым і вясна ідзе наўскос" [1, с. 123]; "Ноччу прысніўся В. Аскоцкі, які прывёз тры гадзіннікі. Усё трывожней цікаюць гадзіннікі, час ідзе" [1, с. 146].

Аднак да заўчаснага скону В. Бечыка застанецца яшчэ крыху больш за пяць гадоў, таму тэма смерці, дамінуючая на старонках дзённіка, пастаянна пераплятаецца з яго літаратурна-крытычнымі разважаннямі, які шчыра прызнаецца: "…але літаратуру я люблю, ёю жыву" [1, с. 48]. Ён нястомна пашырае свой літаратурны кругагляд, пастаянна ўзбагачаючыся новымі ведамі. Круг чытання крытыка здзіўляе сваёй шырынёй. У поле яго зроку трапляюць як класічныя аўтары (Ф. Кафка, С. Цвейг і інш.), так і паэты і пісьменнікі, якія прадстаўлялі ў той час сучасны літаратурны працэс (А. Вярцінскі, Я. Еўтушэнка, Ч. Айтматаў, В. Быкаў, У. Караткевіч і інш.). Метад чытання В. Бечыка шмат у чым нагадвае той, якім карысталіся ў старажытнасці манахі. Ён робіць вытрымкі з прачытаных кніг, фіксуючы ў дзённік сугучныя для сябе думкі, спрабуе высветліць сэнс паэтычных радкоў абраных ім для чытання аўтараў, які не ляжыць на паверхні і які не паддаецца адназначнай інтэрпрэтацыі. Пры гэтым аб большасці з іх крытык на старонках дзённіка стварае свайго роду творчыя партрэты, у некалькіх сказах заўважаючы ў іх творчай манеры ўсё самае

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

арыгінальнае і непаўторнае. Кожны з такіх запісаў, верагодна, мог бы стаць у далейшым асновай фундаментальнага артыкула пра творчасць таго ці іншага аўтара. Напрыклад, вось якая характарыстыка творчай спадчыны У. Караткевіча прадстаўлена на старонках дзённіка: "Караткевіч – паэт жыццёвага шчасця, пераможнай рамантыкі, вольнага і гарманічнага і ўсеабдымнага кахання. Вольна яму насяляць нашу гісторыю замкамі і прыгодамі, вольна славіць жыццёвае свята, стыхію, нечаканыя сустрэчы, шчымлівыя разыходжанні, каб за ўсім уславіць галоўнае, што ў чалавеку ёсць: сілу яго пачуццяў, стыхію жыцця, каханне. Усе мэты, справы, абавязкі – умоўнае, няіснае, побач з гэтай плынню разняволенных пачуццяў, вызваленнасці ад дробязнасці, мітусні, бесталковіцы. Яго неразуменні, разыходжанні – шляхі да згоды, прадвеснікі шчасця" [1, с. 99–100]. Пры гэтым В. Бечык, які стаяў ля вытокаў новага беларускага літаратуразнаўства, што імкнулася пазбавіцца ад метадалогіі сацыялістычнага рэалізму, агаворвае ў дзённіку тыя крытэрыі, якім павінен адпавядаць абраны ім для аналізу тэкст: "Твор, яго змястоўнасць залежыць ад колькасці і сілы, якасці сувязей з намі, з людзьмі, з часам, з гісторыяй, з эстэтычным вопытам. Тое, што пазбаўлена духоўнасці, стаіць за межамі паэзіі" [1, с. 60]; "Найбольш беспрынцыпная сфера – палавыя адносіны" [1, с. 64] і г. д. Тым самым крытык яшчэ і яшчэ раз пацвярджае сваё творчае крэда, што было сфармулявана і неаднаразова працытавана на старонках дзённіка: "Толькі не маніць і ў прынцыпах не хістацца! – вось што важнае мяне зараз турбуе" [1, с. 104]; "Аднаму не здраджваць – даўняму свайму прынцыпу: лепей менш ды лепш" [1, с. 113]; "Але нязменны прынцып: ідзі сваёй дарогай, не прыстасоўвайся, ігнаруючы іх узаемаадносіны. І – не зніжай крытэрыяў, а заўсёды – аб'ектыўную праўду" [1, с. 164].

1985 год ставіць кропку ў душэўных пакутах В. Бечыка і падводзіць вынік яго жыццёвага шляху. Крытык зноў трапляе ў бальніцу, дзе яму ставяць несуцяшальны дыягназ, які несумяшчальны з жыццём: "Што павінен адчуваць чалавек, якому пастаўлены дыягназ: рак або лімфасаркома. Або пазней, пастаянна: падазрэнне на магнілізацыю. Што? Ды нічога асаблівага. Нельга панікаваць. Страх толькі за іншых – за маму і жонку. Што чакае тады іх?" [1, с. 294].

На парозе смерці ён чытае "Споведзь" Л. Талстога, яшчэ раз аддаючы даніну павагі спавядальна-дзённікавай прозе, што стала напрыканцы жыцця асноўным відам яго літаратурна-крытычнай дзейнасці: "«Я всею душой желал быть хорошим; но я был молод, у меня были страсти, а я был один, совершенно один, когда искал хорошего» (Толстой, «Исповедь»)" [1, с. 285]. З душы В. Бечыка вырываецца адзіны лямант адчаю, за які ён просіць прабачэння. У ім – квінтэсенцыя ўсіх яго жыццёвых пошукаў і пакут: "Прабачце. Я галадаў і мёрз, я не меў дзяцінства, я дзічэў у адзіноце 43-га – 44-га года, я быў інвалідам другой групы, я не буду мець уласных дзяцей і наўрад ці прыйдзе хто на маю магілу" [1, с. 270]. У апошнія хвіліны жыцця дзённік для В. Бечыка становіцца свайго роду тэстаментам, выніковай споведдзю, магчымасцю падвесці не папярэднія, а канчатковыя вынікі жыцця: "Што датычыць самога, то можна падбіць рахункі: жыў, як умеў, сумленна і нікому не жадаў зла (хоць, бывала, уступаў з некім у канфлікты, страшэнна канфліктаў не любячы)" [1, с. 294].

Апошні запіс у дзённіку датуецца 4 лістапада 1985 года – за восем дзён да смерці аўтара. Развітальныя словы адрасаваныя не маме і не жонцы, а І. Хадановічу: "Смутак. Бараўлянскі смутак. Шкода прапушчанага, нязробленага. Смутак па тым жа Ігару, па яго так недарэчна абарваным лёсе" [1, с. 294]. 13 лістапада ва ўзросце сарака шасці гадоў душа В. Бечыка пакінула гэты свет. За некалькі гадоў да гэтага ён запісаў у дзённіку: "Сёння я не хачу паміраць" [1, с. 172], аднак лёс, які адтэрмінаваў на час свой прысуд, не праявіў такой добразычлівасці да аднаго з самых таленавітых крытыкаў беларускага літаратуразнаўства 20 стагоддзя…

**Спіс літаратуры**

1 Бечык, В. Радкі і жыццё : старонкі дзённіка / В. Бечык. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1993. – 295 с.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ